


## Секцыя 4

## БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КЛАСІКА

*Алена Міхайлава (Мінск, Беларусь)*

### ПЯЦЬ РАМАНСАЎ А.В. БАГАТЫРОВА НА ВЕРШЫ Я. КУПАЛЫ: ВОБРАЗЫ І ПАЭТЫЧНАЯ МОВА

Паэзія Я. Купалы вельмі музычная. Чытаючы яго вершы и паэмы, заўсёды думаеш пра першапачатковае адзінства гэтых відаў мастацтва. І.А. Долбік піша: «Саюз паэзіі і музыкі плённы і вечны. Само паняцце “лірыка” ў антычных грэкаў азначала распеўную дэкламацыю пад акампанемент ліры. Паэты заўсёды адчувалі натхняльную блізкасць музыкі, кампазітары – вобразнае і адухоўленае паэтычнае слова. І, мабыць, за ўсю гісторыю беларускай музычнай культуры ні адзін паэт не паўплываў на яе так глыбока і ўсебакова, як Янка Купала. Няма ніводнага беларускага кампазітара, які б не адгукнуўся на пранікнёнае купалаўскае слова і не меў у сваёй творчасці запаветнай “купалаўскай мелодыі”. Сярод гэтых “мелодый” – дзве оперы, балет, араторыя, кантата, вакальна-сімфанічная паэма, мноства рамансаў, песняў, хароў і інш.» [5, 47]. У сваіх паэтычных творах Я. Купала працягваў літаратурную традыцыю, ужываючы ў назвах зборнікаў і вершаў словы з семантычнага поля ‘музыка’. У.М. Юрэвіч у сувязі з гэтым упамінае зборнікі «Жалейка», «Гусляр» і верш «Гуслі-самаграі»: «У беларускай літаратуры былі ўжо Багушэвічавы “Дудка беларуская” і “Смык беларускі”, была і Цётчына “Скрыпка беларуская”. З’явілася ў гэтым першым аркестры роднай паэзіі і “Жалейка”» [9, 64], «Працуючы над вершамі, што пазней складуць другі зборнік – “Гусляр”, Купала насычае іх новым зарадам рамантызму, імкнецца прыўзняцца над навакольнай будзённасцю і, не адмаўляючыся ад суб’ектыўнага адчування, ісці на смелыя абагульненні канкрэтных праяў жыцця. … Ідэя ўслаўлення гераічнага подзвігу мастака з народа, імкненне раскрыць неўміручасць таленту, яго бязмерную сілу, здольную здзівіць увесь свет, выспявае ў творчасці Купалы паступова, становячыся лейтматывам многіх вершаў. Прыгадаем хоць бы яго “Гуслі-самаграі”, чый звон вечны…» [9, 90–91]. Моцны ўплыў на яго паэзію аказала народная творчасць, якая надала ёй меладычнасць. М.Р. Ярош пісаў: «Заслуга Купалы ў тым, што ён здолеў

дабіцца спалучэння мелодыі народнай песні са строгай адточанасцю класічнага верша. Як ні ў каго з тагачасных паэтаў, верш Купалы гнуткі, музычны. Энергічны і пругкі, ён гучыць раскаціста і маштабна, рытмічная плынь яго свабодная і шырокая» [10, 146–147].

Многія з твораў вялікага беларускага паэта былі пакладзены на музыку і такім чынам атрымалі «другое жыццё». Ф. Ваданосава так апісвае гэтыя музычна-паэтычныя творы: «… у фондах купалаўскага Музея захоўваюцца ноты і тэкст “Пяці рамансаў на словы Янкі Купалы” А. Багатырова (пад рэдакцыяй Мікалая Аладава), выдадзеных у 1954 г. Калі прачытаеш назвы рамансаў, а потым перачытаеш вершы Янкі Купалы, разумееш вытанчаны густ, рамантычнасць кампазітара, яго глыбокае адчуванне паэзіі народнага песняра. “Паляці, мая мысль”, “Думка”, “Дуб”, “Жняя”, “За свабоду сваю”… Тое ж датычыцца і многіх іншых твораў, у тым ліку і пазнейшага часу» [3, 90]. Т. Ляшчэня расказвае пра стварэнне вядомым беларускім кампазітарам А.В. Багатыровым цыкла рамансаў: «У 1947 г. А. Багатыроў завяршыў працу над вакальным цыклам **“Рамансы на словы Я. Купалы”**. У цыкле аб’яднаны пяць вершаў розных гадоў: “Паляці, мая мысль…”, “Думка”, “Дуб”, “Жняя”, “За свабоду сваю”. Кампазітар падаў іх у паслядоўнасці, якая арганізуе змест твораў у драматургічна знітаваную структуру, што з’яўляецца абавязковай умовай пры стварэнні цыклічнай формы. Гэтыя вершы аб’ядноўвае адзіны галоўны вобраз – асоба паэта, яго светапогляд, яго прызначэнне, яго сістэма каштоўнасцяў. Выразна акрэслена і галоўная ідэя цыкла: паэт з яго творчасцю як сімвал свабоды і яе носьбіт. Ён мае адзінае багацце, якое не прадаецца і не купляецца, – вольную думку і народжанае ёю слова…» [8, 77]. Яна выказвае такую думку: «Вытокі ўстойлівай прыхільнасці кампазітара да вакальнай мініяцюры – ў непазбыўным інтарэсе да паэзіі, у патрэбе музычнага суперажывання, духоўнага водгуку на новыя адкрыцці ў светаадчуванні чалавека, да якіх далучаешся пры дапамозе самабытнага паэтычнага слова. У сваіх вакальных сачыненнях кампазітар з’яўляецца тонкім знаўцай паэзіі, яе патрабавальным знатаком. Кожны са створаных ім вакальных цыклаў – сведчанне скрупулёзнай працы па адбору паэтычных тэкстаў» [7, 5]. Прааналізуем вершы Я. Купалы, якія сталі музычна-паэтычнымі творамі.

Раманс «Паляці, мая мысль…» [1, 3–7] напісаны Багатыровым на аднайменны верш Я. Купалы [6, 139–140]. У гэтым паэтычным творы мысль паэта параўноўваецца з птушкай («Паляці, мая мысль, // Лётам сокала…» [6, 139]), з нечым светлым, пазітыўным («Лётам светлай зары // Па-над стрэхамі – // Сып надзеяй жывой // І пацехамі» [6, 139]), з цудоўнай музыкай («Пей аб волі людзям // Думкі цудныя…» [6, 139]).

Пры яе дапамозе жыццё ў людзей павінна змяніцца: яно будзе, як сон; будзе шчаслівы лёс і воля: «Гоняць хай ад сябе // Цьмы нядольныя, // І рука у руку // Пойдуць вольныя» [6, 139]. Мыслі творцы і зямлі неабходна аб'яднацца («Так ляці, эй, ляці, // Мысль свабодная! // А ты міла спаткай, // Зямля родная» [6, 140]). Я. Купала ў дадзеным тэксце ўжывае метафары ([мысль] «І прагледзь гэты свет // Кругом-вокала» [6, с. 139] і інш.), эпітэты («Залатыя сны ім // Няхай рояцца…» [5, с. 139] іінш.), паўторы («Так ляці, эй, ляці, // Мысль свабодная!» [6, с. 140] і інш.), анафару («Залатыя сны ім // Няхай рояцца; // Няхай жаль на душы // Супакоіцца» [6, 139]), параўнанні («Паляці, мая мысль, // Лётам сокала…» [6, 139] і інш.) і інш.

Другі верш Я. Купалы («Рвіся, думка!..» [6, 141]), абраны А.В. Багатыровым для стварэння романса «Думка» [1, 8–12], тэматычна звязаны з першым вершам і таксама прысвечаны ментальнай сферы чалавека. Думка паэта, як і мысль, набывае рысы птушкі («Рвіся, думка маладая, // Туды, вышай, далей!» [6, 141]), якая імкнецца да ўсяго станоўчага – да праўды, шчасця і свабоды. Яна павінна не даваць спаць людзям («Стане горай непрыветна, // Калі будзем спаці. // Дык жывуча, скокам-бокам, // Покі сэрца точыш, // Рвіся, думка, ненарокам…» [6, 141]), адалець нуду («Рвіся! рвіся! дый старайся // Нуду адалеці…» [6, 141]). Аўтар верша выкарыстоўвае метафары («Покі старасць неўдалая // Костак з ног не вале…» [6, 141] і інш.), эпітэты («К таей праўдзе ненапраснай…» [6, 141] і інш.), паўторы («Рвіся, покі будзе ясна, // Покі будзе годзе!» [6, 141] і інш.), анафару («К таей праўдзе ненапраснай, // К шчасцю і свабодзе; // Рвіся, покі будзе ясна…» [6, 141]) і інш. Апелюючы да думкі, паэт карыстаецца звароткамі («Рвіся, думка, ненарокам…» [6, 141] і інш.).

Вобраз дуба, прадстаўлены ў рамансе А.В. Багатырова «Дуб» [1, 13–17] і аднайменным вершы Я. Купалы [6, 22], авеяны адзінотай («Распусціўшы сучча // У глухім прыволлі, // Сам адзін расце ён // На далёкім полі» [6, 22]) і магутнасцю («Як цар, у кароне, // Аб нічым ні дбае…» [6, 22]). Дуб мудры, ён добра ведае народную творчасць («Многа казак знае, // Многа песень чуе» [6, 22]). Дрэва старое, таму яно ўжо патроху губляе сваю моц («Дождж падмыў карэнне; // Ў ім дупло – як хата…» [6, 22]). Але пакуль дуб уражвае ўсіх («Ён стаіць і дрэмле – // Грозны, расахаты» [6, 22]). Я. Купала ў гэтым сачыненні ўжывае метафары («На адным ён месцы // Днюе і начуе…» [6, 22] і інш.), эпітэты («Распусціўшы сучча // У глухім прыволлі…» [6, 22] і інш.), параўнанні («Ў ім дупло – як хата…» [6, 22] і інш.), анафары («Ці то стогне бура, // Ці віхор гуляе» [6, 22] і інш.) і інш.

У рамансе А.В. Багатырова «Жняя» [1, 18–22] і аднайменным вершы Я. Купалы [6, 45–46] лірычная гераіня параўноўваецца з царыцай; усё, што яна мае, успрымаецца вельмі пазітыўна («З каласкоў вяночак – // Моладасці сведка – // На ёй зіхаціцца, // Як у садзе кветка» [6, 45]). Прырода выяўляе свае добрыя адносіны да жняі («Вецер абнімае // Стан яе дзявочы, // Сонца ёй цалуе // Шыю, твар і вочы» [6, 45]). Жняя ўмее не толькі добра працаваць, але і прыгожа спяваць («А яна – царыца – // Весела, шчаслiва // Карануе песняй // Залатое жніва» [6, 46]). Яна ўпэўнена ў сваім шчаслівым лёсе ў роднай краіне («Смела йдзе у сонцы, // Ўся сама – як сонца, // Гэта жнейка наша // Ў нашаей старонцы» [6, 46]). Паэт у названым творы выкарыстоўвае метафары («Дзівіцца ігруша // На мяжы зялёнай» [6, 45] і інш.), эпітэты («На грудзях шчаслівых // Каптанок ружовы…» [6, 45] і інш.), паўторы («Смела йдзе у сонцы // Ўся сама – як сонца…» [6, 46] і інш.), параўнанні («Як сама царыца // Ў залатой кароне, // Йдзе яна ў вяночку // Паміж спелых гоняў» [6, 45] і інш.) і інш.

Апошні раманс з вакальнага цыкла, створанага А.В. Багатыровым, – «За свабоду сваю» [1, 23–27]. У вершы «За свабоду сваю…» [6, 58] Я. Купала паказвае, што свабода для яго – гэта вялікая каштоўнасць («За свабоду сваю // Ўсёй душой пастаю; // У агонь, у ваду // Я за ёю пайду» [6, 58]), нават больш важная, чым жыццё («Лепей сам сябе дам // Пахаваці людзям, // Як свабоду хаваць, // Злыбядзе аддаваць» [6, 58]). Свабода была ў паэта з маладосці («Ў сэрцы, ў думках сваіх // З самых лет маладых // Я яе ўзгадаваў // І сваёю назваў…» [6, 58]). Ён заклікае сілы прыроды спяваць аб яго свабодзе: «Гэй ты, гэй, вецер, пей // А свабодзе маей!» [6, 58] і інш. Аўтар верша ўжывае метафары («Гэй ты, гэй, бор, шумі, // А свабодзе грымі!» [6, 58] і інш.), паўторы («Гэй ты, гэй, вецер, пей // А свабодзе маей!» [6, 58] і інш.), устойлівыя выразы («У агонь, у ваду // Я за ёю пайду» [6, 58] і інш.) і інш. У творы шмат зваротkaў і дзеясловаў у форме загаднага ладу («Гэй ты, сонца, гары // Ад зары да зары, // Ланцугі распалі // Па ўсёй чыста зямлі!..» [6, 58] і інш.).

Тры вершы – «Паляці, мая мысль…», «Думка» і «За свабоду сваю…» – прысвечаны тэме волі (у двух першых творах рэалізаваны вобраз нейкай ментальнай сутнасці чалавека, якая ўвасабляе яго жаданні і ідэалы); вершы «Дуб» і «Жняя» звязаны з Беларуссю – з прадстаўніком яе расліннага свету і з працоўным чалавекам гэтай краіны. Дадзеныя вершы невыпадкова абраны А.В. Багатыровым і аб’яднаны ў цыкл. Па-першае, яны вельмі дакладна перадаюць сутнасць паэзіі Я. Купалы, якая апавядае пра Радзіму, якую ён марыў бачыць вольнай, квітнеючай і вельмі прыгожай; па-другое, яны змяшчаюць тропы (метафары, эпітэты,

параўнанні), лексіка-сінтаксічную фігуру (анафару – у 3 творах) і інш., што садзейнічае іх музычнаму ўвасабленню. У песеннай творчасці беларускіх кампазітараў 70-х–80-х гг. XX ст. выяўляецца «…вобраз “малой Радзімы”, які вельмі часта пераплятаецца з успамінамі светлай пары дзяцінства…» [2, 30]. Тэма любові «…да роднага краю ў творчасці кампазітараў гэтага часу, як правіла, нараджае *песню-споведзь…*» [2, 31]. Так і ў творах А.В. Багатырова і Я. Купалы – вобраз Радзімы ў іх светлы, адзіны і непаўторны; лепшага месца, чым Беларусь, для кампазітара і паэта няма на ўсёй зямлі.

Кожны кампазітар знаходзіць у купалаўскай паэзіі нешта сваё: «Адных кампазітараў у паэзіі Янкі Купалы вабіць багацце светапогляду, светаадчування і шчодрасць пачуццяў, іншых – пафас грамадзянскай лірыкі, але перш за ўсё слых кампазітараў улоўлівае непаўторную музыкальнасць купалаўскага верша, яго інтанацыйную і рытмічную разнастайнасць» [5, с. 48]. Да паэзіі Я. Купалы звярталіся, акрамя А.В. Багатырова, М.М. Чуркін [4, 33–39], А.Я. Туранкоў [4, 24–27], М.І. Аладаў [5, 47], Р.К. Пукст [4, 6–9], П.П. Падкавыраў [4, 22–23], Д.А. Лукас [4, 14–21], Ю.У. Семяняка [4, 3–5] і іншыя кампазітары. Кожны з іх своеасабліва перадаваў у музыцы змест паэтычных твораў гэтага таленавітага аўтара. У прааналізаваных музычна-паэтычных творах – пяці рамансах А.В. Багатырова на вершы Я. Купалы – вобраз Беларусі і адданай ёй крэатыўнай асобы; глыбокія думкі вядомага беларускага паэта, выяўленыя ў прыгожай форме; цудоўная музычная раэлізацыя.

**Літаратура:**

1. Багатыроў, А.В. Пяць рамансаў на словы Янкі Купалы / А.В. Багатыроў. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя музычнай літаратуры, 1954. – 32 с.
2. Белорусская музыка 1960–1980-х годов / сост. проф. К.И. Степанцевич; под ред. проф. Г.С. Глущенко. – Минск: Беларусь, 1997. – 359 с.
3. Ваданосава, Ф. “Музыка – блізкая сястра Купалавай паэзіі…”: Творчыя стасункі Янкі Купалы і Анатоля Багатырова / Ф. Ваданосава. – Роднае слова. – 2002. – № 7. – С. 89– 90.
4. Вакальныя творы на словы Янкі Купалы / склаў і адрэдагаваў Д. Жураўлёў. – Мінск: Беларусь, 1972. – 40 с.
5. Долбік, І.А. Творчасць Янкі Купалы ў музычным увасабленні: Дыдактычны матэрыял / І.А. Долбік // Роднае слова. – 2002. – № 7. – С. 46–48.
6. Купала, Я. Збор твораў: у 7 т. / Я. Купала. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1976. – Т. 3: Вершы. Пераклады 1911–1917. – 1973. – 432 с.

7. Лещеня, Т.С. Поэтика жанра романса в творческом наследии А.В. Богатырева / Т.С. Лещеня // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2003. – № 4. – С. 4–14.
8. Ляшчэня, Т. Паэзія Янкі Купалы ў творчасці Анатоля Багатырова / Т. Ляшчэня. – Роднае слова. – 2002. – № 7. – С. 76–79.
9. Юрэвіч, У.М. Янка Купала: Нарыс жыцця і творчасці / У.М. Юрэвіч [Для сярэд. і ст. школ. узросту]. – Мінск: Нар. асвета, 1983. – 208 с.
10. Ярош, М.Р. Песняр роднай зямлі: Жыццё і творчасць Я. Купалы / М.Р. Ярош; прадмова В.П. Жураўлёва. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 341 с.